Рэспубліканская нарада старшынь выканкомаў Саветаў дэпутатаў працоўных

АБ ЗАДАЧАХ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ПА ВЫКАНАННЮ РАШЭННЯЎ XXI З'ЕЗДА КПСС І СТУДЗЕНЬСКАГА ПЛЕНУМА ЦК КПСС І АБ ПАЛЯПШЭННІ ІХ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ І ГАСПАДАРЧАЙ РАБОТЫ

З даклада Старшыні Савета Міністраў БССР Ц. Я. КІСЯЛЁВА

1961 год, гаворыць дакладчык, стаў гістарычным годам. Геніем савецкага чалавека ажыццёўлена самая смелая мара: здзейснен трыумфальны палёт у космас.

Увесь свет усё яшчэ працягвае знаходзіцца пад уражаннем найвялікшага заваявання савецкай навукі і тэхнікі, трыумфу чалавечага розуму, перамогі нашай вялікай Радзімы, якая запусціла ў космас карабель з чалавекам на борце. Усе мы з вамі ганарымся тым, што іменна наш суайчыннік, грамадзянін Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік Юрый Аляксеевіч Гагарын першым праклаў шлях у Сусвет, стаў першым касманаўтам свету. Гэта — выдатная перамога не толькі нашай навукі і тэхнікі, гэта перамога мужнасці савецкага чалавека, найярчэйшае сведчанне бясспрэчных пераваг нашага сацыялістычнага ладу, магутнасці Савецкай дзяржавы. гэта вынік мудрай і гераічнай дзейнасці нашай слаўнай Камуністычнай партыі, яе ленінскага Цэнтральнага Камітэта, які ўзначальвае Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў.

Уся дзейнасць Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада накіравана на тое, каб забяспечыць далейшы росквіт сацыялістычнай Радзімы, няспынны ўздым дабрабыту працоўных. У барацьбе за ажыццяўленне гэтай задачы велізарную ролю адыграе студзеньскі Пленум ЦК КПСС, які з'явіўся важнейшай падзеяй у жыцці нашай партыі і народа. Пленум распрацаваў канкрэтную праграму далейшага развіцця ўсіх галін сельскагаспадарчай вытворчасці.

У рэспубліцы праведзена значная арганізатарская і масава-палітычная работа па растлумачэнню і практычнаму ажыццяўленню задач, пастаўленых Пленумам. Калгасы і саўгасы, партыйныя і савецкія органы рэспублікі распрацавалі мерапрыемствы па далейшаму павелічэнню вытворчасці збожжа, тэхнічных культур, гародніны, бульбы, мяса, малака і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў. У гэтай вялікай рабоце прымалі ўдзел шырокія масы калгаснікаў, рабочых саўгасаў, спецыялісты сельскай гаспадаркі, работнікі навуковых устаноў. Мерапрыемствы абмяркоўваліся на нарадах перадавікоў сельскай гаспадаркі раёнаў, абласцей, на пленумах абкомаў і райкомаў партыі, на сесіях Саветаў. Пленум ЦК КПБ, які адбыўся гэтымі днямі,

гаспадаркі можна толькі тады, калі будзеш ведаць яе і займацца вырашэннем пэўных канкрэтных пытанняў разам з калгаснікамі, рабочымі саўгасаў, спецыялістамі. Ён расказвае, што нядаўна работнікі апарату Савета Міністраў БССР знаёміліся з работай выканкомаў сельсаветаў Горацкага раёна. Асабліва непрыглядной аказалася работа выканкома Макараўскага сельсавета. Старшыня выканкома тав. Мануленка слаба ведае становішча спраў у калгасах.

Кожны кіраўнік выканкома Савета, кожны дэпутат і савецкі актывіст, працягвае дакладчык, павінен цвёрда засвоіць, што для мясцовых Саветаў цяпер няма больш важнай задачы, чым актыўная, настойлівая барацьба за ажыццяўленне рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС. за выкананне дзяржаўных заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў кожнай брыгадай і фермай, кожным калгасам і саўгасам, кожным сельсаветам і раёнам.

Неацэннае значэнне ў паспяховым выкананні задач, намечаных студзеньскім Пленумам ЦК КПСС, мае велізарная арганізатарская работа, праведзеная пасля Пленума таварышам М. С. Хрушчовым. Яго выступленні на занальных нарадах работнікаў сельскай гаспадаркі, практычныя парады і заўвагі, якія ёсць у яго прамовах, з'яўляюцца каштоўнейшым практычным кіраўніцтвам у штодзённай нашай дзейнасці.

Тав. Кісялёў спыняецца на асноўных пытаннях, на якіх павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу мясцовыя Саветы, арганізоўваючы ажыццяўленне намечаных мерапрыемстваў.

Цяпер у калгасах і саўгасах рэспублікі самы адказны перыяд. Ідзе веснавая сяўба, Гэта першы і самы важны этап барацьбы за высокі ўраджай. Правесці сяўбу хутка і добра, выканаўшы ўсе агратэхнічныя правілы, — значыць выйграць першую бітву за ўраджай. Трэба дапамагчы калгасам і саўгасам умела ўсё спланаваць, правільна расставіць людзей, разумна арганізаваць іх працу. А трэба сказаць, што тэмпы сяўбы і якасць палявых работ не ўсюды здавальняючыя.

...тым годзе грэчкі 162,6 тысячы гектараў.

У павелічэнні вытворчасці збожжа павінна адыграць таксама пэўную ролю расшырэнне пасяўных плошчаў зернебабовых, гароху, фасолі. Пасевы гэтых культур у 1961 годзе намечана давесці да 34,5 тысячы гектараў, а ў 1965 годзе—да 110 тысяч гектараў.

Кармавыя бабы і іншыя бабовыя культуры—каштоўнейшы бялковы корм. У рэспубліцы ёсць добры вопыт вырошчвання высокіх ураджаяў гароху, пялюшкі, вікі, сырадэлі, кармавых бабоў. Трэба вывучыць гэты вопыт, вывучыць агратэхніку вырошчвання гэтых вельмі патрэбных культур.

Беларусь—вядучая рэспубліка ў краіне па вытворчасці льну. Ільнаводства з'яўляецца адной з важнейшых крыніц даходаў калгасаў. Аднак за апошні час увага да гэтай культуры крыху аслаблена. У многіх калгасах спецыялізаваныя льнаводчыя звенні распаліся, і пасевы льну аказаліся абязлічанымі. Менш выдзяляецца ўгнаенняў пад лён, у выніку чаго ўраджайнасць яго не расце, якасць ільнопрадукцыі не паляпшаецца. Згодна з прынятымі абавязацельствамі, калгасы і саўгасы паставілі задачу ў 1963 годзе атрымаць 110 тысяч тон валакна—дасягнуць узроўню, запланаванага на канец сямігодкі. Для гэтага трэба давесці ўраджайнасць ільновалакна не менш чым да 4 цэнтнераў з гектара.

Далей дакладчык спыніўся на задачах па далейшаму павелічэнню вытворчасці бульбы, цукровых буракоў, гародніны, расшырэнню садоў і ягаднікаў у калгасах і саўгасах. Асаблівую ўвагу, сказаў ён, трэба ўдзяліць павышэнню ўраджайнасці бульбы, паляпшэнню насенняводства. Трэба ўсямерна ўкараняць комплексную механізацыю на вырошчванні бульбы. Неабходна таксама максімальна механізаваць вырошчванне гародніны, павышаць яе ўраджайнасць, зніжаць сабекошт.

У адпаведнасці з рашэннямі студзеньскага Пленума ЦК КПСС у рэспубліцы павінны значна павялічыцца пасевы цукровых буракоў як для тэхнічных, так і для кармавых мэт. К канцу сямігодкі плошчы пад гэтай культурай у параўнанні з 1960 годам толькі для тэхнічных мэт павінны амаль падвоіцца.

торфа-гноевыя, торфа-фекальныя, торфа-жыжкавыя, гноева-земляныя, аргана-мінеральныя сумесі. Важна выкарыстоўваць, асабліва для падкормкі раслін, вадкія ўгнаенні. Неабходна шырока ўжываць зялёныя ўгнаенні і г. д.

Закранаючы пытанні далейшага развіцця жывёлагадоўлі, тав. Кісялёў гаворыць, што галоўным, ад чаго залежаць тэмпы росту вытворчасці малака і мяса, з'яўляецца павелічэнне пагалоўя кароў і павышэнне іх прадуктыўнасці. Для таго, каб выйсці на рубеж сямігодкі па вытворчасці малака і мяса, трэба за пяць год сямігодкі, што засталіся, павялічыць пагалоўе кароў амаль у два разы. Галоўнай крыніцай папаўнення грамадскага статку кароў павінна з'явіцца ўласнае ўзнаўленне ў калгасах і саўгасах. Адбор, захаванне і гадаванне цялушак у калгасах і ў саўгасах павінны быць узяты пад штодзённы кантроль кожным сельскім Саветам. Выканкомы мясцовых Саветаў павінны дапамагчы калгасам у павышэнні тэмпаў росту грамадскага статку.

Усім вядома, адзначае дакладчык, якой вялікай крыніцай вытворчасці мяса з'яўляецца свінагадоўля. Аднак у многіх месцах гэтая справа недаацэньваецца і вядзецца на нізкім узроўні. У 1960 годзе ні адна вобласць не выканала прынятых абавязацельстваў па вытворчасці свініны. У многіх гаспадарках было дапушчана змяншэнне колькасці асноўных свінаматак, познія апаросы іх, не ліквідаван самацёк у адборы і злучцы разавых свінаматак. Да гэтага часу разбазарваецца вялікая колькасць парасят.

ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР неаднаразова звярталі ўвагу савецкіх, сельскагаспадарчых органаў, кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў на надзвычай трывожнае становішча, якое стварылася з авечкагадоўляй. Пагалоўе авечак у рэспубліцы не толькі не расце, а з году ў год скарачаецца. У грамадскіх гаспадарках Высокаўскага, Полацкага, Лоеўскага, Радунскага, Смалявіцкага, Крычаўскага раёнаў за 1960 год пагалоўе авечак зменшылася на адну чвэрць. Тлумачыцца гэта толькі пагардлівымі адносінамі многіх кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў да авечкагадоўлі. Выкан-

...тарскай работай, за ўменнем мабілізаваць масы, савецкі актыў на выкананне і перавыкананне пастаўленых задач. Пры гэтым трэба ўсямерна ўмацоўваць дзяржаўную дысцыпліну, павысіць адказнасць кіруючых кадраў; спыняць малейшыя спробы парушаць ленінскія прынцыпы гаспадарання.

Студзеньскі Пленум ЦК КПСС, сказаў дакладчык, строга асудзіў антыпартыйныя дзеянні асобных кіраўнікоў якія замест арганізатарскай работы ў масах па выкананню прынятых абавязацельстваў сталі на шлях падману партыі і дзяржавы — ашуканства, прыпісак да справаздачнасці, усялякіх спекуляцыйных і іншых махінацый. На жаль, такія факты мелі месца і ў нашай рэспубліцы. Знайшліся ў нас такія работнікі, якія страцілі сумленнасць і праўдзівасць перад партыяй і народам. Хто ашуквае партыю і дзяржаву, той павінен несці суровую адказнасць. Такіх работнікаў трэба, як сказана ў рашэнні студзеньскага Пленума ЦК КПСС, выключаць з партыі і аддаваць пад суд. ЦК КПБ і Саветам Міністраў БССР былі ўскрыты факты ашуканства, прыпісак у Лідскім, Жалудоцкім, Воранаўскім, Іванаўскім, Пінскім, Баранавіцкім, Ганцавіцкім, Нясвіжскім і некаторых іншых раёнах. Цэнтральным Камітэтам і абкомамі КПБ сурова пакараны кіраўнікі партыйных і савецкіх органаў гэтых і іншых раёнаў за патуранне і прымірэнцкія адносіны да ашуканцаў.

Далей дакладчык указвае на тое, што многія работнікі Саветаў не ўнікаюць у эканоміку калгасаў і саўгасаў, не навучыліся лічыць, аналізаваць, выяўляць і прыводзіць у дзеянне рэзервы. Выканкомам Саветаў неабходна штодзённа займацца наладжваннем фінансавай работы ў калгасах і саўгасах, уліку і справаздачнасці.

...ках, у органах аб'яднання «Бел-сельгастэхніка», у нарыхтоўчых органах.

Дакладчык спыніўся далей на задачах паляпшэння культурна-бытавога абслугоўвання насельніцтва. За апошнія гады мясцовыя Саветы рэспублікі правялі немалую работу па будаўніцтву жылля, бытавых прадпрыемстваў, паляпшэнню гандлёвага і медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Толькі за два гады сямігодкі ў гарадах набудавана больш чым 110 тысяч кватэр, а ў сельскай мясцовасці — звыш 54 тысяч дамоў. Праведзены таксама вялікія работы па добраўпарадкаванню гарадоў і вёсак.

У дакладзе прыводзіцца рад станоўчых прыкладаў дзейнасці савецкіх органаў па кіраўніцтву гарадской гаспадаркай. Выканком Баранавіцкага гарсавета забяспечыў у мінулым годзе выкананне плана па будаўніцтву і рамонту жылля, добраўпарадкаванню горада. Вялікая работа ў гэтым напрамку праводзіцца выканкомамі Барысаўскага, Пружанскага і іншых гарадскіх Саветаў, Іжскага сельсавета Вілейскага раёна, Стара-Руднянскага — Жлобінскага раёна, Гарбацэвіцкага — Бабруйскага раёна, Кіраўскага — Слуцкага раёна і многімі іншымі.

У той жа час, гаворыць тав. К[...]сялёў, работа многіх выканком[...] вядзецца на нізкім узроўні. А[...]ным з сур'ёзных недахопаў у [...] дзейнасці з'яўляюцца слабая а[...]ганізацыя выканання і кантро[...] за выкананнем дырэктыў партыі [...] ўрада. Нярэдка іх роля зводзіц[...] да правядзення пасяджэнняў і [...] рад, прыняцця шматлікіх раш[...]няў. Пры гэтым забываецца, ш[...] галоўнае ў рабоце не пасяджэнн[...] нарады, а жывая работа ў мас[...] практычная арганізацыя выкана[...]ня дырэктыў партыі і ўрада, [...] станоў вышэйшых партыйных і [...]вецкіх органаў і сваіх уласн[...] рашэнняў.

Вялікую дапамогу ў рабоце в[...]канкомам могуць аказаць паста[...]ныя камісіі Саветаў. З дапамо[...] актыву яны могуць кваліфікава[...] разабрацца ў становішчы спра[...] брыгадзе, на ферме і арганізава[...] калгаснікаў на ліквідацыю вы[...]леных недахопаў. Ёсць нямала [...]кіх камісій, якія правільна буду[...] сваю работу і дабіваюцца добр[...] вынікаў. Гэта можна паказаць [...] прыкладзе работы пастаяннай [...]місіі па дарожнаму будаўніц[...] Прыборскага сельсавета Гом[...]скага раёна. Вядома, што да[...] ў сельскай мясцовасці знаходз[...]ца яшчэ ў няважным стане. Е[...] старшыні сельскіх Саветаў, [...] такі стан дарог спрабуюць ап[...]даць тым, што, маўляў, дзяржа[...] для гэтай мэты мала выдзяляе[...]

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ